# МЕМАРЫЯЛЬНЫЯ ДОШКІ ВУЧОНЫМ

**Г. У. КАРЗЕНКА,**
**аспірант Інстытута гісторыі АН БССР**

Вуліцы і будынкі нашай сталіцы захоўваюць памяць аб выдатных падзеях і людзях, якімі ганарыцца наш народ. Мемарыяльныя дошкі памагаюць узнавіць канкрэтныя гістарычныя ўмовы, у якіх жылі і тварылі выдатныя партыйныя, дзяржаўныя і грамадскія дзеячы, пісьменнікі, кампазітары. Шматлікія мемарыяльныя знакі ўвекавечваюць памяць дзеячаў навукі і тэхнікі рэспублікі.

На доме № 12 па Ленінскаму праспекту ўстаноўлена мемарыяльная дошка, на якой напісана: «У гэтым доме жыў выдатны савецкі вучоны, прэзідэнт Акадэміі навук БССР Герой Сацыялістычнай Працы Васіль Феафілавіч Купрэвіч».

Імя гэтага чалавека — выдатнага вучонага-біёлага, члена-карэспандэнта АН СССР і акадэміка АН БССР, буйнога арганізатара навукі — шырока вядомае не толькі ў нашай рэспубліцы, але і далёка за яе межамі.

Васіль Купрэвіч нарадзіўся 14 студзеня 1897 г. у беднай сялянскай сям'і ў в. Кленнікі Мінскай губерні. Пазней галеча прымусіла дапытлівага хлопца шукаць шчасця ў Пецярбургу. В. Купрэвіч апынуўся ў школе юнгаў, а затым, калі пачалася першая сусветная вайна, быў залічаны ў Балтыйскі ваенны флот і праходзіў службу на эсмінцы «Самсон» у якасці старшыны-камендора. У кастрычніку 1917 г. дваццацігадовы марак прымаў удзел у штурме Зімняга палаца і наступных баях.

Пасля дэмабілізацыі Васіль Феафілавіч вучыўся на рабфаку і вярнуўся ў родную вёску ўжо настаўнікам. Пазней ён напіша: «Выкладаць даводзілася ўсё адразу — і батаніку, і матэматыку, і фізіку, і геаграфію». Малады настаўнік распрацоўвае новыя метады выкладання, становіцца заўзятым краязнаўцам. У друку з'яўляюцца яго першыя артыкулы.

Шлях у вялікую навуку пачынаецца з 1931 г., калі В. Ф. Купрэвіч паступіў у аспірантуру Батанічнага інстытута АН СССР. У лістападзе 1941 г. у асаджаным Ленінградзе ён паспяхова абараняе доктарскую дысертацыю. Як вучоны В. Ф. Купрэвіч вядомы даследаваннямі ў мікалогіі, фізіялогіі хворай расліны і глебавай энзімалогіі. Ім напісана больш як 100 навуковых прац, многія з якіх набылі вядомасць за рубяжом.

У 1952 г. В. Ф. Купрэвіч быў абраны прэзідэнтам Акадэміі навук Беларускай ССР. Тут раскрыўся талент яго як арганізатара навукі. За перыяд з 1952 па 1969 г. АН БССР вырасла ў некалькі разоў па колькасці супрацоўнікаў, з'явілася шмат новых інстытутаў (фізікі, матэматыкі, ядзернай энергетыкі, тэхнічнай кібернетыкі і інш.). Па шэрагу напрамкаў беларуская навука заняла вядучае месца ў СССР.



В. Ф. Купрэвіч неаднаразова выбіраўся членам ЦК КПБ, дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР. Яму было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

Памёр славуты вучоны 17 сакавіка 1969 г. Мемарыяльная дошка ўстаноўлена ў 1972 г., скульптар С. Адашкевіч.

У станаўленні і развіцці беларускай савецкай гістарычнай навукі вялікую ролю адыгралі акадэмікі АН БССР У. М. Перцаў і М. М. Нікольскі.

Уладзімір Мікалаевіч Перцаў нарадзіўся 28 ліпеня 1877 г. у г. Курску. Яшчэ ў рэальным вучылішчы праявіў цікавасць да гуманітарных навук, асабліва да гісторыі. У 1897 г., самастойна падрыхтаваўшыся і здаўшы экзамены за курс гімназіі, юнак паступіў у Маскоўскі універсітэт.

У. М. Перцаў актыўна ўдзельнічаў у студэнцкіх выступленнях напярэдадні рэвалюцыі 1905—1907 гг. У аўтабіяграфіі

ён пісаў: «За ўдзел у студэнцкіх хваляваннях я два разы падвяргаўся выключэнню з універсітэта (у 1899 і 1901 гг.), прычым пасля кароткага (двухтыднёвага) зняволення ў Бутырскай перасылачнай турме кожны раз падвяргаўся высылцы з Масквы ў г. Курск пад нагляд паліцыі».

У. М. Перцаў закончыў вучобу з дыпломам I ступені і быў пакінуты пры кафедры ўсеагульнай гісторыі для падрыхтоўкі да прафесарскага звання з выплатай стыпендыі імя Граноўскага. Аднак пражыць на стыпендыю было цяжка (у 1890 г. памёр бацька), і ён заняўся педагагічнай дзейнасцю ў сярэдніх навучальных установах Масквы.

З лютага 1920 г. гісторык плённа працуе ў Віцебску, а з кастрычніка 1921 г.— у Мінску. У. М. Перцаў — адзін са стваральнікаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Разам з У. І. Пічэтам, М. М. Нікольскім, С. Я. Вальфсонам і іншымі шмат сіл, энергіі і таленту вучоны аддае станаўленню і развіццю вышэйшай адукацыі ў Беларусі.

У. М. Перцаў — гісторык з шырокімі навуковымі інтарэсамі. Ім напісаны шэраг прац па гаспадарчаму, сацыяльнаму ладу і культуры старажытнага насельніцтва Прусіі, гісторыі французскай рэвалюцыі канца XVIII ст. Шмат гадоў вучоны плённа працаваў у галіне вывучэння гісторыі беларускага народа. Пад яго рэдакцыяй выйшлі абагульняльныя працы і зборнікі дакументаў па гісторыі БССР.

Плённую навуковую работу У. М. Перцаў спалучаў з грамадскай дзейнасцю. Ён быў дэлегатам-заснавальнікам ААН ад Беларускай ССР, і яго подпіс стаіць пад Статутам гэтай арганізацыі. Уладзімір Мікалаевіч выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. З 1943 па 1960 г. быў акадэмікам-сакратаром аддзялення грамадскіх навук АН БССР. Меў урадавыя ўзнагароды.

У. М. Перцаў памёр 3 чэрвеня 1960 г. Мемарыяльная дошка ўстаноўлена па вул. Леніна, дом № 3.

Беражліва захоўвае наш народ памяць пра вядомага гісторыка-ўсходазнаўцу М. М. Нікольскага. Ён нарадзіўся ў Маскве ў 1877 г. у сям'і буйнога вучонага-ўсходазнаўцы М. В. Нікольскага. Закончыўшы з залатым медалём гімназію, ён паступіў на гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага універсітэта. У гады першай рускай рэвалюцыі малады выкладчык гісторыі актыўна дапамагае лектарскай групе Маскоўскага камітэта РСДРП(б).

У савецкі час найбольш поўна разгарнулася навуковае і педагагічнае дараванне вучонага. У ліпені 1922 г. М. М. Нікольскі прыязджае ў Мінск і становіцца прафесарам БДУ. З гэтага часу ўсё яго жыццё звязана з Беларуссю. З 1931 г. Мікалай Міхайлавіч узначальваў сектар




этнаграфіі і фальклору Інстытута гісторыі АН БССР, а ў 1937—1953 гг. быў дырэктарам гэтага інстытута.

Грамадзянскі і партыйны подзвіг вучонага асабліва ярка праявіўся ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Знаходзячыся ў акупіраваным Мінску, М. М. Нікольскі падтрымліваў цесныя сувязі з камуністычным падполлем. Не спыняе вучоны і навуковай работы. У гэты перыяд ім завершана работа над рукапісам кнігі «Прыватнае землеўладанне і землекарыстанне ў старажытным Двухрэччы», напісана вялікая праца, якая выйшла пасля вайны пад назвай «Эцюды па гісторыі фінікійскіх абшчынных і земляробчых культаў».

М. М. Нікольскі праявіў сябе як буйны даследчык сацыяльна-эканамічнай гісторыі і культуры старажытнага Вавілона, старажытнай гісторыі гарадоў Фінікіі і як крытык Бібліі. У пасляваенныя гады вучоны займаўся даследаваннем этнаграфіі і фальклору Беларусі. Ім апублікавана звыш 500 прац.

Навуковыя заслугі М. М. Нікольскага высока ацэнены Савецкім урадам. Ён быў абраны членам-карэспандэнтам АН СССР, з'яўляўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

Памёр М. М. Нікольскі 19 лістапада 1959 г. На доме № 30 па вул. К. Маркса ўстаноўлена мемарыяльная дошка работы скульптара С. Вакара.

На будынках Мінска ўстаноўлена 20 мемарыяльных дошак, якія ўвекавечваюць памяць беларускіх вучоных. Сярод іх дошкі ў гонар акадэмікаў АН БССР




М. С. Акулава (вул. Акадэмічная, 16; 1977 г.), П. Ф. Глебкі (вул. К. Маркса, 36; 1972 г.), М. Ф. Ярмоленкі (вул. Сурганава, 9; 1977 г.), Я. Коласа (на галоўным корпусе АН БССР; 1969 г.), Я. Р. Канавалава (вул. Жодзінская, 4; 1976 г.), І. С. Лупіновіча (вул. Казінца, 90; 1970 г.), А. В. Лыкава (вул. Падлесная, 15; 1976 г.), М. Ц. Лынькова (Ленінскі пр., 12; 1976 г.), М. Я. Мацапуры (вул. Леніна, 13; 1980 г.), М. М. Паўлючэнкі (вул. Сурганава, 9; 1976 г.), В. В. Папова (вул. Савецкая, 17; 1980 г.), М. А. Прыляжаева (вул. Ленінградская, 14; 1981 г.), М. У. Смольскага (вул. Захарава, 25; 1977 г.), М. К. Юскаўца (на будынку БелНДІ эксперыментальнай ветэрынарыі), заслужаных дзеячаў навукі і тэхнікі БССР члена-карэспандэнта АН БССР І. М. Лушчыцкага (бульвар Луначарскага, 5; 1975 г.), М. В. Дарашэвіча (вул. Дарашэвіча і галоўны корпус БПІ), Героя Савецкага Саюза прафесара Я. У. Клумава (на будынку 3-й клінічнай бальніцы).

На вуліцах Мінска ўвекавечана памяць і іншых вучоных.

М. І. Пірагоў (1810—1881) — вялікі рускі хірург, анатам і педагог, заснавальнік ваенна-палявой хірургіі і хірургічнай анатоміі, член-карэспандэнт Пецярбургскай Акадэміі навук. Ім упершыню была праведзена аперацыя пад наркозам на полі бою. Сусветную вядомасць набыў яго атлас «Тапаграфічная анатомія». Мемарыяльная дошка ўстаноўлена на вул. Пірагова, 3.

М. А. Сямашка (1874—1949) — выдатны дзеяч Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы, адзін з арганізатараў савецкай аховы здароўя, акадэмік АМН СССР і АПН РСФСР. Мемарыяльная дошка ўстаноўлена на вул. Сямашкі, 3.

І. В. Курчатаў (1903—1960) — савецкі вучоны, заснавальнік сучаснай ядзернай фізікі, лаўрэат Ленінскай і чатырох Дзяржаўных прэмій СССР, тройчы Герой Сацыялістычнай Працы. Роля і значэнне вучонага ў даследаванні праблем фізікі атамнага ядра, выкарыстання яе ў мірных мэтах і для ўмацавання абараназдольнасці нашай краіны агульнавядомыя. Яго імем названа вуліца ў Мінску, мемарыяльная дошка ўстаноўлена ў 1974 г.

Мемарыяльныя дошкі з'яўляюцца неаддымнай часткай гісторыі культуры горада і сведчаць аб значэнні працы, навуковых адкрыццяў і здзяйсненняў вучоных.




# КЛУБ ТВОРЧЫХ СУСТРЭЧ

У калгасе «Чырвоная зорка» Магілёўскага раёна адкрыўся музычны салон — места творчых сустрэч з кампазітарамі, спевакамі, пісьменнікамі, калектывамі мастацкай самадзейнасці. Першая такая сустрэча адбылася з артыстамі Белдзяржфілармоніі. Аркестр выканаў некалькі музычных п'ес Бетховена, Шапэна. Гучалі таксама беларускія, украінскія, рускія народныя песні.